# 600 гадоў – гэта ўзрост

Нацыянальны парк “Белавежская пушча” захаваў марку нетолькі ўнікальнага помніка прыроды, але і сапраўднай жамчужыны Еўропы.

Асабіста для мяне кожная паездка ў Нацыянальны парк "Белавежская пушча" — свята ў любое надвор'е, пад любы настрой. Пушча — гэта асаблівы свет. Здаецца, трапляеш у казку, у далёкае дзяцінства, калі дрэвы былі вялікія. Высокія, у тры абхваты хвоі пранізваюць верхавінамі падобныя на пышныя вясковыя падушю аблокі. Толькі ўявіце гэтыя хвоі і дубы-патрыярхі захоўваюць у сваей памяць нямала таямніц аб паляваннях вялікіх князёў Вігаўта і Ягайлы — так-так, у пушчы ёсць 600-гадовыя дубы.

Першае ўпамінанне аб гэтым лясным масіве адносіцца да 983 года і звязана са знаходжаннем у запаведным лесе кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. З 1409 года ў польскіх і граматах пушчу сталі называць Белавежскай.

Сёння Белавежская пушча — самы буйны і самы тытулаваны біясферны запаведнік Еуропы. Святкаванне 600-годдзя ўсталявання запаведнага рэжыму — народам, якія прыклалі намаганні да захавання Белавежскай пушчы. Таму ў першую суботу кастрычніка сабраліся ў пушчы прадстаўнікі розных краін — беларусы, палякі, літоўцы, рускія.

Свята з нагоды юбілейнай даты прайшло з размахам. А яшчэ большы размах папярэднічаў святу. Пераўтварэнні ў нацыянальным парку начынаюцца адразу за шлагбаўмам. Да юбілею з'явіўся эколага - асветніцкі цэнтр з музеем прыроды — адзіны ў сваем родзе не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе. Тут па крупінках сабрана ўся гісторыя Белавежскай пушчы: арыўныя матэрыялы і фатаграфіі, успаміны сведкаў. Цяпер музей прыроды — гэта чатыры экспазіцыйныя залы. Каля ўвахода ў першую залу наведвальнікі ўбачаць старога знаёмага — зубра Пугенала, які сустракаў турыстаў і папярэднія сорак гадоў. Далей — абсалютна новая экспазіцыя. Да святочных мерапрыемстваў выдадзены кнігі і фотаальбомы, у пушчы з'явіўся свой герб і сцяг.

— О, як тут усё змянілася. Мы на суткі ўсяго прыехалі ў пушчу. У Беларусі, у Вецебску на "Славянсым базары" бываем часта, а вось у пушчы не былі з 1975 года, — народная артыстка СССР Аляксандра Пахмугава не хавала свайго захаплення ад убачанага. Яны з Мікалаем Дабранрававым — аўтары вядомай песні "Белавежская пушча" — былі ганаровымі гасцямі на свяце. Мікалай Мікалаевіч напісаў новы верш, прысвечаны пушчы, так што не выключена з'яўленне новага песеннага шэдэўра.

Дарэчы, у мінулым годзе нацыянальны парк наведалі амаль трыста тысяч чалавек. У гэтым колькасць гасцей значка перавысіць гэту лічбу.

**Источник:** Беларусь.-2009.-№ 11.-С.28.